А.А. Вырва (УА МДПУ, імя І.П. Шамякіна, Мазыр)

# ТЭАТРАЛІЗАЦЫЯ ФАЛЬКЛОРУ ЯК МЕТАД ФАРМІРАВАННЯ ГРАМАДЗЯНСКАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ

Сучаснае становішча грамадства нашай краіны ставіць перад сістэмай адукацыі вельмі важную задачу – выхаванне не толькі ўсебакова развітай асобы школьніка, але і выхаванне грамадзяніна, патрыёта сваёй Айчыны. Актуальнасць гэтай праблемы тлумачыцца наступнымі абставінамі: ад узроўню сфарміраванасці грамадзянскай самасвядомасці залежыць лёс нашай краіны [1; 6] ва ўмовах суверэннай Рэспублікі Беларусь ад членаў грамадства патрабуецца актыўная жыццёвая пазіцыя для таго, каб увайсці ў сусветную цывілізацыю і пры гэтым застацца самабытным і самастойным народам.

Працэс фарміравання грамадзянскай самасвядомасці больш эфектыўна праходзіць у падлеткавым і юнацкім узросце. Таму галоўным інстытутам у гэтым накірунку з'яўляецца школа, дзе адбываецца мэтанакіраваны працэс выхавання маладой асобы. У гэты час ажыццяўляецца паэтапнае ўключэнне школьнікаў у жыццё соцыуму, назапашваюцца веды аб нормах паводзін, засваенне прынятых у грамадстве каштоўнасцей, законаў і норм, прывіццё патрыятычных пачуццяў. У выніку складваецца ўласная актыўная грамадзянская пазіцыя.

У сувязі з гэтым паўстае задача: распрацаваць навуковы падыход да фарміравання грамадзянскай самасвядомасці, рэалізаваць яго ва ўмовах сучаснай сістэмы адукацыі, прааналізаваць вынікі.



МГПУ им. И.П. Шамякина

Перад кожным метадам выхавання у народнай педагогіцы стаяць наступныя задачы: выхаванне маральных якасцей чалавека, патрыятычных пачуццяў, духоўнасці, гуманізму, чалавечнасці, што з'яўляецца падмуркам для фарміравання грамадзянскай самасвядомасці.

Этнапедагогіка – гэта невычарпальная крыніца для сучаснай педагогікі. Метады, сродкі і прынцыпы выхавання дзяцей бяруць свой пачатак у народнай педагогіцы. Выхаваць чалавека-патрыёта без нацыянальнага выхавання немагчыма, таму што задачай народнай педагогікі з'яўляецца перадача назапашанага стагоддзямі вопыту маладому пакаленню, уключэнне яго ў грамадскую вытворчую працу, прывіццё працоўных навыкаў.

Адным з метадаў народнай педагогікі з'яўляецца выкарыстанне ў працэсе выхавання фальклору і яго тэатралізацыя. Гэты метад вельмі прадуктыўны ва ўмовах школы, таму што ен змяшчае шматлікія віды дзейнасці:

– вывучэнне фальклорных твораў, аб'яднанне іх адзіным сюжэтам;
– раскрыццё зместу гульнёвых, карагодных, танцавальных і іншых песень пры дапамозе драматычных прыёмаў і сродкаў;
– выкарыстанне адпаведных атрыбутаў народнага мастацтва, народных касцюмаў і інш.;
– выпрацоўка ўменняў і навыкаў выканання неабходных рухаў, мізансцэн;
– знаёмства з асновамі харэаграфіі;
– пераапрананне ў розныя вобразныя персанажы народных абрадаў;
– вывучэнне сэнсу каляндарных і сямейна-абрадавых песень, асноўнай сімволікі, птушак, раслін, дрэў у фальклоры;
– выкарыстанне гульнёвых і забаўляльных форм фальклору пры засваенні народных песень;
– узнаўленне фрагментаў альбо элементаў народных абрадаў, рытуалаў;
– развіццё творчай фантазіі асобы, якая займаецца падрыхтоўкай таго ці іншага свята.

Выкарыстанне розных відаў дзейнасці пры рэалізацыі дадзенага метаду дае станоўчыя вынікі.

Для дасягнення пастаўленых мэт неабходна выкарыстоўваць прынцыпы, якія дапамагаюць рэалізаваць гэты метад:

– культурная традыцыйнасць;
– выхаванне гістарычнай свядомасці;
– актыўнасць;
– комплекснасць;
– сістэмнасць;
– міжпрадметная інтэграванасць.

МГПУ им. И.П. Шамякина

У працэсе работы над тэатралізацыяй фальклору прымяняюцца наступныя формы арганізацыі дзейнасці: індывідуальная і групавая. Пры індывідуальнай форме кожны удзельнік рыхтуецца самастойна. Адшуквае неабходныя звесткі, плануе неабходныя этапы сваёй работы, што садзейнічае развіццю ўмення правільна і карысна арганізаваць свой вольны час. Пры групавой форме ідзе непасрэдная падрыхтоўка да тэатралізацыі свята: развучваюцца песні, элементы харэаграфіі, падрыхтоўка атрыбутаў народнага мастацтва, народных касцюмаў і інш. Гэтыя віды работы дапамагаюць дзецям зразумець неабходнасць працаваць у калектыве, вызначыць значнасць сваёй працы.

Пры арганізацыі дадзенага метаду вялікае значэнне мае праца з сям'ёй. Калі тэатралізацыяй фальклору займацца з школьнікамі молодшага ўзросту, то дапамога бацькоў ім неабходна. А гэта садзейнічае больш цеснаму ўзаемадзеянню сям'і і школы, у выніку якога рашаецца цэлы шэраг задач:

– павышэнне педагагічнай культуры бацькоў;

– стварэнне пазітыўнага мікраклімату ў сям'і;

– стварэнне спрыяльных умоў для фарміравання грамадзянскага выхавання.

Адметнай рысай гэтага метаду з'яўляецца тое, што школьнік бачыць вынікі сваёй дзейнасці. А гэта вельмі важна. У працэсе тэтралізацыі кожны суб'ект можа дастаткова рэалізаваць свае магчымасці, што дае станоўчы ўплыў на развіццё асобы.

Метад тэатралізацыі фальклору цесна звязаны з іншымі метадамі народнага выхавання: назіраннем, выпрабаваннем, прывучаннем, парадай, заахвочваннем, асуджэннем, вывучэннем краязнаўства і інш.

Такім чынам, актыўнаму працэсу фарміравання грамадзянскай самасвядомасці школьнікаў садзейнічаюць метады народнай педагогікі. Метад тэатралізацыі фальклору з'яўляецца вельмі прадуктыўным у гэтым накірунку, таму што пад яго ўздзеяннем фарміруецца асоба з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

***Літаратура***


1. Альшэўская, Н.У. Выхаванне грамадзянскай самасвядомасці ў вучняў старэйшых класаў на матэрыяле гуманітарных дысцыплін: манаграфія / Н.У. Альшэўская. – Мн.: Бестпрынт, 2002. – 236 с.

2. Арлова, Г.П. Беларуская народная педагогіка / Г.П. Арлова. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 120 с.

3. Концепция гражданского воспитания младших школьнико в РБ: [Проект] / В.В. Буткевич [и др.] // Пачатковая школа. – 2002. – № 6. – С. 2-5.


МГПУ им. И.П.Шамякина